# *Леў Сапега*

*Авечка Дзіяна*

# Біяграфія

- Нарадзіўся ў 1557 г. у вёсцы Астроўна(цяпер Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці).Яго сямейныя карані ўзыходзяць да старажытнага роду смаленскіх баяр.Дзяцінства Льва Сапегі прайшло ў Нясвіжы пры двары Радзівілаў.Вядомы магнат канцлер ВКЛ Мікалай Радзівіл Чорны накіраваў юнака на вучобу ў Лейпцыгскі універсітэт.Пасля ён вярнуўся на радзіму і атрымаў пасаду каралеўскага пісара пры Стафане Баторыі.



- Кароль заўважыў здольнага да дзяржаўнай службы “ўрадніка” і ў 1585 г. прызначыў Льва Сапегу падканцлерам ВКЛ.А ў 1589 г. Леу Сапега стаў канцлерам краіны.Ён таксама выконваў абавязкі віленскага ваяводы і нават вялікага гетмана Княства.На ўсіх пасадах Леў Сапега паказваў сябе здольным і таленавітым палітыкам,мудрым дзяржаўным дзеячам.

# Погляды і дзейнасць

- Леў Сапега быў прадстаўніком і выразнікам інтарэсаўсвайго асяродзя. Ён належаў да той яго часткі, што імкнулася выкарыстаць у сваіх мэтах новыя дасягненні ў грамадзкай думцы. Яго дзейнасць аб’ектыўна спрыяла развіццю і ўмацаванню на Беларусі ў 2-й палове 16 ст. прагрэсіўнай свецкай сацыяльна-палітычнай думкі.
- За імём Льва Сапегі звязваюць падрыхтоўку і выданне Трэцяга Статуту Вялікага Княства Літоўскага (1588) і стварэнне ў 1581 Галоўнага Трыбуналу — найвышэйшай судова-апэляцыйнай інстанцыі дзяржавы.

# Леў Сапега



# Лівонская вайна

- У перыяд Лівонскай вайны Леў Сапега на свае сродкі сфарміраваў  гусарскі полк і пасяхова вая-ваў пад Вялікімі Лукамі і Псковам.Неаднаразова ўзначальваў пасольствы ў Маскоўскую дзяржаву, з якой праводзіў мірныя перагаворы.Леў Сапега выступаў з ідэяй абяднання Рэчы Паспалітнай і Расіі ў федэратыўную дзяржаву.

- Апошнія гады жыцця гэты дзяржаўны дзеяч правёў у Вільні,дзе займаўся ўпарадкаваннем дакументаў *Метрыкі*(архіва) ВКЛ.У Ружанах (цяпер гарадскі пасёлак у Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці) ён сабраў вялікую бібліятэку.Памёр Леў Іванавіч Сапега ў 1633 г. і быў пахаваны ў касцёле Святога Міхаіла ў Вільні.
- Такім чынам,Вялікае Княства Літоўскае захавала ў складзе Рэчы Паспалітай элементы самастойнага развіцця,што дае падставу ўжываць выраз *«дзяржава абодвух народаў»*


ЛЕЎ САПЕГА
1557-1633
Zoocoin
collection

- *Дзякуй за прагляд*